УДК 19962120

*Н.В.КУЗЬМІЧ*

# МАСТАЦКАЕ РАШЭННЕ МАРАЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ У НАВЕЛАХ УЛАДЗІМІРА СЦЯПАНА

Маральна-этычныя пошукі ўласцівы чалавецтву ва ўсе часы існавання. Пошук мяжы паміж дабром і злом, сэнсу быцця характэрны яшчэ для мысліўцаў Антычнасці. Праблемы даследавання духоўных і маральных арыенціраў чалавека – "вечныя". Духоўная дзейнасць параджае пэўныя погляды, ідэі, уяўленні; тут увасабляюцца мары чалавека, яго памкненні, пажаданні, ідэалы. Элементы пазіцыі "чалавек – мараль" знаходзяцца ў арганічнай узаемасувязі і ўзаемазалежнасці.

Усе стагоддзі перажывалі перыяды бурных вырашэнняў старых і новых пытанняў пра чалавека, яго месца і прызначэнне ў свеце. Але наша стагоддзе як мага актуалізіравала і драматызавала комплекс пытанняў, звязаных з чалавекам. Працэс ломкі каштоўнасных прыярытэтаў параджае расчараванне ў былым і сітуацыю няспраўджаных спадзяванняў на лепшае. Чалавек шукае апірышча: звяртаецца да кансерватыўных ці рэзка выходзіць за межы традыцыйных каштоўнасцей. Дэвальвацыя маральных каштоўнасцей у наш час выклікала звышактуальнасць маральнай праблематыкі. Гэта праблема знайшла сваё адлюстраванне ў мастацкай літаратуры. Усё больш увага літаратуры канцэнтруецца на праблемах чалавечага жыцця, асобы, унутранага свету; гэта вядзе да развіцця інтэлектуальнага пачатку ў літаратуры, да гуманістычнасці. Аб'ектам мастацкага даследавання становіцца жыццёвы, маральны прынцып, калі пісьменнік пранікае ў сферу самапазнання чалавека.

Своеасабліва люструецца праблема чалавека нашага часу, чалавечых стасункаў у навелах Уладзіміра Сцяпана. Пісьменнік па-мастацку даследуе духоўна-маральныя памкненні, сэнс чалавечага жыцця, імкнецца пранікнуць у духоўны свет асобы-сучасніка. Кожны яго твор – своеасаблівая міні-праблема. Аўтар не павучае, не апісвае, а проста паказвае. У творах няма расцягнутых разважанняў, а толькі дзеянне. Лаканічнага пісьма, накіраванага на паглыбленне зместу, вымагае і жанр навелы (гэты жанр мае пэўную спецыфіку ў асэнсаванні і падачы часавых і прасторавых арыенціраў, сюжэтнай дзеі, кампазіцыйнай структуры, у мастацкіх прыёмах). Аб'ект мастацкага даследавання пісьменніка – чалавек сённяшняга дня, яго стасункі з іншымі людзьмі. Эпізоды, пераствораныя пісьменнікам, – лакальныя сітуацыі – звычайныя побытавыя (сустрэча братоў, размова бацькі з сынам і г.д.); героі – звычайныя людзі.

Мастацкая задума ў творы рэалізуецца ва ўсёй сістэме тропікі. З дапамогай мастацкіх прыёмаў вобразы і сітуацыі выдаюць больш яркімі, выразнымі. Мастацкая дэталь, эпітэт, кантраст умела выкарыстоўваюцца аўтарам; у звязку яны працуюць на раскрыццё аўтарскай задумы, існуюць узаемазвязана, ствараючы мастацкую тканіну твора.

Мастацкая дэталь – гэта "выразная падрабязнасць у творы, якая нясе значную сэнсавую і ідэйна-эмацыянальную нагрузку. Да дэталі мастацкай адносяць пераважна падрабязнасці быту, пейзажу, партрэта, інтэр'ера, а таксама жэсту, суб'ектыўнай рэакцыі, дзеяння і мовы (т.зв. моўная характарыстыка)" [1]. Функцыя мастацкай дэталі – псіхалагізацыя, г.зн. выяўленне ўнутранага стану, матываў і прычын паводзін і ўчынкаў герояў. Мастацкая дэталь – адзін з кампанентаў у структуры вобраза, у сваёй

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

сукупнасці фарміруе пластычную фактуру твора. Яна эмацыянальна ўздзейнічае на чытача, выклікае ў яго пэўную рэакцыю, таму пісьменнік шчыльна напаўняе мастацкую дэталь сэнсам. У навелах У.Сцяпана на мастацкую дэталь (падрабязнасці быту, інтэр'ера, партрэта, інш.) кладзецца псіхалагічная нагрузка; на фоне сюжэтнай дзеі яна ўзрастае. Часам мастацкая дэталь становіцца скразной (паўтараецца пры пэўных сюжэтных паваротах), што ўзбагачае сэнсавы план твора. Напрыклад, гарэнне запалкі (Пакуль гарыць запалка // ЛіМ. – 1997. – 4 красавіка). Яна (мастацкая дэталь. – Н.К.) паўтараецца ў навеле чатыры разы: тройчы ўспыхвае ў руцэ Папова, выпрабоўваючы спрыт радавога Швідкога, і адзін раз – у прывязанай да ржавай трубы руцэ сяржанта, калі яму пагражае зброяй радавы, даведзены здзекам да адчаю. Абодва не па тэрміне скончылі службу ў войску: адзін аднаго псіхічна скалечылі. З дапамогай мастацкай дэталі ў мастацкай прасторы твора выразней і дакладней выяўляецца ўсё, што фарміруе характары і паводзіны герояў. У асобных навелах мастацкая дэталь пераходзіць з развязкай у адзін з кампанентаў параўнання; параўнанне вынікае з логікі паводзін персанажаў, якая падаецца праз мастацкую дэталізацыю. Напрыклад, хруст звычайнага курынага яйка (Браты // Крыніца. – 1995. – №10). Мастацкая дэталь заўсёды яркая, трапная, выразная, насычаная сэнсам, схоплівае самы істотны бок (рысу з'явы) прадмета. З яе дапамогай падкрэсліваецца непрыняцце пабытовай жорсткасці людзей. Самае страшнае, што смерць у жыццёвых варунках (у кватэры Язэпа Хамяка ("Браты"), на беразе ракі ("Паэты") і проста жорсткасць параўноўваюцца з будзённай з'явай.

Трапна выкарыстоўваецца эпітэт. Ён стварае фон для сюжэтнай дзеі, узмацняе сэнсавы план твора, у некаторых творах з'яўляецца міні-дэталлю. Эпітэт – "...вобразнае азначэнне прадмета / з'явы... У адрозненне ад звычайнага лагічнага азначэння, якое вылучае дадзены прадмет з многіх..., Э. ці вылучае ў прадмеце адну з яго ўласцівасцей, ці – як метафарычны Э. – пераносіць на яго ўласцівасці іншага прадмета..." [2]. На эпітэт кладзецца сэнсавая нагрузка, што надае эмацыянальную афарбоўку аповеду. З дапамогай эпітэтаў чытач раскрывае падтэкставы пласт твора; эпітэт надае больш густых фарбаў сітуацыям і характарам. У звязку з іншымі мастацкімі прыёмамі раскрывае праблемны план твора, высвечваючы важныя аспекты праблемы, што закранае аўтар. У навеле "Пётар і сын" (Крыніца. – 1995. – №10) эпітэт скразны (паўтараецца на працягу сюжэтнай дзеі) – бурштынавы. Колер цёмны, "цяжкі" для ўспрымання, надае адпаведны тон дзеянню, стварае адпаведную эмацыянальную атмасферу. У бурштынавых промнях сонца зіхацяць яблыкі (пачатак твора, у колеры – засцярога, напружанасць, фон); бурштынавы сонечны шар хіліцца да захаду (бацька з сынам размаўляюць пра гаспадарку, курэць); і тое ж бурштынавае сонца завальваецца за дрэвы (пасля развязкі – сын дзеўбануў відэльцам у вока бацьку). Як і астатнія мастацкія сродкі, эпітэт у творах не проста так, не дзеля прыгажосці; ён заўсёды трапны, яркі, стварае своеасаблівае эмацыянальна-псіхалагічнае поле, сэнсава насычае мастацкую тканіну твора. У навеле "Пагаворым" (Крыніца. – 1995. – №10) – чысцюткабелы абрус, цёмна-чырвоныя кроплі ліпкага лікёру на ім (тут і своеасаблівы кантраст) і цёмна-бурштынавыя вочы адной з гераінь. Гэта своеасаблівы фон да цяжкай размовы паміж дзвюма жанчынамі, своеасаблівая прыступка да жахлівай развязкі, дзе бачым, што каштуе жыццё чалавека... У навеле "Ітака" (ЛіМ. – 1996. – 4 кастрычніка) шмат ацэначных эпітэтаў (лесвіца з шырокімі прыступкамі, балюстрада з пачварна пукатымі балясінамі, мёртвы фантан, інш.); кожны з іх – своеасаблівая мастацкая

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

міні-дэталь, кожны мае сваю танальнасць, якая адпавядае настрою апавядальніка-аўтара.

Творы пабудаваны з дапамогай своеасаблівага кантраста. Кантраст можа быць не яўным супрацьпастаўленнем, праяўляцца толькі ў ходзе сюжэтнай дзеі, у дыялогах, выказваннях, пры дапамозе эпітэтаў. Кантраст нясе сэнсавую і эмацыянальную нагрузку, глыбока і рэзка паказвае з'яву ці вобраз, тым самым дапамагае акрэсліць характар і духоўны свет, памкненні герояў (дагледжаная трыццаціпяцігадовая прыгажуня і жанчына-падлетак у пацёртых джынсах; Б.Г., высокі, у шэрым паліто, з дагледжанымі сіваватымі вусамі, і яго калега-паэт Б.Ц., з зямлістым тварам; інш.). З дапамогай кантрасту на першы план вылучаюцца асобныя рысы вобраза, што спрыяе разуменню яго чытачом, памкненняў героя, яго ўнутранага стану, маральных арыенціраў і каштоўнасцей. На своеасаблівым кантрасце пабудавана ўсё ў творы: самі героі, іх дзеянні, словы, думкі, інш.

Мастацкія прыёмы арганічна ўзаемазвязаны ў навелах У.Сцяпана, заўсёды выклікаюць асацыяцыі, ствараюць эмацыянальна-псіхалагічны фон, на якім глыбей разумееш чалавека. Сітуацыі і вобразы ярка выпісаны рукой мастака; калі адкінута другаснае, неістотнае, чалавек паўстае ў сваіх сапраўдных праявах (так і ў навелах Ул. Сцяпана).

## *ЛІТАРАТУРА*

1. Литературный энциклопедический словарь. – М., 1997. – С.90.
2. Литературный энциклопедический словарь. – М., 1997. – С.512-513.